Рыгор Лазько
(Гомель)

Польска-савецкія мірныя перамовы і лёс БССР

„Нас падзялялі — хто? Чужаніцы, цёмных дарог махляры...”. Верш Якуба Коласа, які змяшчае гэтыя радкі, апошнім часам неаднаразова цытаваўся беларускімі гісторыкамі, даследчыкамі навейшай гісторыі нашай дзяржаўнасці. Яго папулярнасць сярод гісторыкаў вызначаецца не толькі закладзенай у ім дынамікай, дэфіцыт якой адчуваецца ў нашым грамадстве, але і выказанай у ім смелай і трапнай думкай, якую самі гісторыкі, пісаўшыя аб польска-савецкай вайне на працягу 70 гадоў, выказаць былі няздольныя. Гэта думка аб тым, што на мірных перамовах у Рызе, якімі завяршылася вайна, Беларусь была падзеленая аднолькава чужымі ёй суседнімі дзяржавамі. Заўважым, што тэма аб падзеле Беларусі „чужаніцамі” на працягу 1920-х гадоў была ці не найбольш гучнай у беларускай грамадзянскай паэзіі. Але з пэўнага часу аб падзеле стала пісаць небяспечна. Гісторыкі, можна меркаваць, хутчэй за паэтаў адышлі ад гэтай тэмы і пачалі пісаць аб захопе Заходняй Беларусі „буржуазна-памешчыцкай Польшчай”. У такім стане даследаванне гэтай праблемы заставалася да нядаўняга часу. У апошнія гады сітуацыя палепшылася за кошт пашырэння крыніцавай базы даследавання шляхам увядзення ў навуковы ўжытак новых крыніц (лістоў Аляксандра Чарвякова з Рыгі, асобных дакументаў наркама Георгія Чычэрына, вядомых беларускім гісторыкам, галоўным чынам, у выглядзе копій з маскоўскага архіва, і асобных фрагментаў рашэнняў вышэйшых органаў савецкай улады). На гэтай аснове асобным беларускім гісторыкам удалося сфармуляваць новыя ацэнкі праблемы падзелу Беларусі ў выніку польска-савецкай вайны. З гісторыкаў старэйшага пакалення, можа, найдалей ад панаваўшай аднабаковай ацэнкі адышоў Вадзім Круталевіч, які сапраўды напісаў аб падзеле, а не аб захопе, але тлумачыць яго толькі недахопам сіл у Чырвонай Арміі, каб яму перашкодзіць. Маладзейшы гісторык Сяргей Хоміч выказаў больш смелую думку: кіраўніцтва Савецкай Расіі свядома аддало Польшчы спрадвечна беларускія землі ў інтарэсах сусветнай рэвалюцыі[1]. Аднак гэтыя слушныя ацэнкі не замацаваныя і не развіваюцца ў новых даследаваннях. Побач з імі ў беларускай гістарыяграфіі выказваюцца думкі, якія бліжэй да гістарычнай белетрыстыкі, чым да навукі[2]. У цэлым жа белару-

[1] С. Хомич, *Польша и белорусский территориальный вопрос (1918-1924 гг.)*, [у:] *Беларусь у XX ст.*, Мінск 2003, вып. 2, с. 318.
[2] *Гісторыя Беларусі: у 6 т.*, т. 5: *Беларусь у 1917-1945 гг.*, Мінск 2006, с. 118.

скія гісторыкі пакуль што не наважваюцца на канцэптуальны зрух у вывучэнні праблемы падзелу Беларусі ў выніку польска-савецкай вайны.

У польскай гістарыяграфіі гэтай праблемы сітуацыя істотна іншая — значна лепшая, нягледзячы на ўласцівы ёй, зрэшты, зразумелы палонацэнтрызм. Найбліжэй яе беларускія аспекты цікавілі Крыстыну Гамулку, Алега Латышонка, Войцеха Матэрскага. Працы гэтых даследчыкаў і найлепш вядомыя ў Беларусі.

Калі ж вярнуцца да беларускай гістарыяграфіі, то ў ёй выяўляецца наступная схема дачыненняў БССР да польска-савецкіх перамоваў аб міры 1920 г.:

1. Пасля працяглай, больш чым двухмесячнай барацьбы беларускіх нацыянал-камуністаў за адраджэнне БССР Пленум ЦК РКП(б) 16 ліпеня 1920 г. прыняў рашэнне аб стварэнні Беларускага рэўкама, што адкрыла магчымасць абвяшчэння рэспублікі.
2. На аснове гэтага рашэння 31 ліпеня ЦК кампартыі Літвы і Беларусі, ЦК Беларускай камуністычнай арганізацыі (БКА), ЦК Бунда і Цэнтральнае Бюро прафсаюзаў Мінска і Мінскай губерні прынялі „Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі”.
3. Дэкларацыя вызначыла прынцыпы фарміравання межаў Рэспублікі: на захадзе — па этнаграфічнай мяжы з буржуазнымі дзяржавамі, а з Савецкай Расіяй і Украінай — на аснове „свабоднага выражэння волі беларускага народа на ўездных і губернскіх з’ездах саветаў пры поўнай згодзе з урадамі РСФСР і ССРУ”[3].
4. Аднак вызначыць межы БССР адпаведна з гэтымі прынцыпамі не дазволіла вайна з Польшай, ход якой склаўся не на карысць РСФСР. Пытанне аб межах вырашалася на польска-савецкіх перамовах аб міры ў неспрыяльных для савецкага боку ўмовах.
5. 10 верасня 1920 г., адзначаюць беларускія гісторыкі, Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР выдаў РСФСР мандат на вядзенне мірных перамоваў з Польшчай ад імя Беларускай Рэспублікі, даверыўшы Савецкай Расіі вырашаць на перагаворах, галоўным чынам, пытанне аб межах Беларусі.
6. Разам з тым, на канферэнцыю ў Рыгу быў накіраваны старшыня ВРК БССР Аляксандр Чарвякоў, не меўшы там пэўнага статуса і не здолеўшы перашкодзіць падзелу Беларусі. 12 кастрычніка 1920 г. была падпісаная прэлімінарная мірная дамова, вызначыўшая мяжу паміж Польшчай і савецкімі рэспублікамі, на

[3] *Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению советской власти и организации социалистического строительства (июль — декабрь 1920 г.). Сб. док. и материалов*, Минск 1957, с. 53-55.

захад ад якой пакідалася значная частка тэрыторыі Беларусі.

7. У сувязі з польска-савецкімі перамовамі на іх заключным этапе ўлады Савецкай Беларусі паспрабавалі вырашыць пытанне аб вяртанні ў склад БССР усходніх тэрыторый, забраных у пачатку 1919 г. Савецкай Расіяй. Дзеля гэтага выкарысталі аргумент аб тым, што такі крок урада РСФСР паслужыць сродкам націску на Польшчу ў ходзе рыжскіх перамоваў на карысць савецкага боку. Аднак гэтая спроба беларускіх камуністаў не прынесла поспеху, БССР засталася існаваць на тэрыторыі, якая ўключала толькі 6 паветаў Мінскай губерні.

Вось такая склалася схема ў даследаваннях беларускіх гісторыкаў.

Пры поглядзе на схему, — як на яе ў цэлым, так і на асобныя яе элементы, — узнікае нямала пытанняў, якія пакуль што не знаходзілі адказу. Першае: які юрыдычны статус меў Ваенна-рэвалюцыйны камітэт БССР? А ў сувязі з гэтым, якія ён меў паўнамоцтвы, і якімі кіраваўся матывамі, прымаючы значныя для Беларусі рашэнні? Перш за ўсё, чаму не настойваў на самастойным прадстаўніцтве БССР на польска-савецкіх мірных перамовах? Калі меркаваць па яго назве, то відавочна, што гэта быў надзвычайны орган, узнікшы ў ходзе ваенных дзеянняў. Аднак чаму так зацягнулася яго існаванне ў гэтым статусе, амаль на паўгода? Успомнім, што ад часу прыняцця рашэння аб утварэнні Беларускай савецкай рэспублікі ў канцы 1918 г. да першага з'езда саветаў, які канстытуіраваў яе (хоць і не надоўга), прайшло крыху больш за месяц. Ці звязана такое прамаруджванне толькі з сітуацыяй на фронце? Магчыма, былі іншыя прычыны? Гэта важна высветліць, бо орган улады, які абапіраецца на вынікі выбараў, валодае большай легальнасцю, чым надзвычайны ваенны орган, і тым самым большымі паўнамоцтвамі для абароны інтарэсаў народа, ад імя якога выступае. А ў Беларусі ў канцы 1920 г. пастаянныя цывільныя органы ўлады былі створаны толькі тады, калі асноўныя падзеі Рыжскай мірнай канферэнцыі, надоўга вызначыўшыя лёс краіны, ужо адбыліся. Нарэшце, неабходна высветліць пытанне аб альтэрнатывах вядомаму і трагічнаму для нашай краіны выніку рыжскіх перагавораў. Калі альтэрнатывы існавалі, то чаму не былі рэалізаваны? Не прэтэндуючы на паўнату і бездакорную дакладнасць адказаў на гэтыя пытанні, спадзяемся аднак паспрыяць іх больш глыбокаму разуменню ў гістарыяграфіі.

Так званае другое абвяшчэнне БССР было вынікам рашэння высокай партыйнай інстанцыі — пленума ЦК РКП(б), што з'яўляецца вядомым фактам і прызнаецца ўсімі сучаснымі даследчыкамі. Але канстатацыі факта яшчэ недастаткова для разумення яго сутнасці. Ён мусіць быць разгледжаны ва ўсіх сваіх сувязях, а значыць, і ў сувязі з папярэдняй палітыкай савецкай улады па беларускім пытанні, і ў кантэкс-

це падзей польска-савецкай вайны і знешняй палітыкі РСФСР у цэлым. Калі з гэтай пазіцыі разглядаць названы факт, то мы прыйдзем да разумення, што рашэнню бальшавіцкага кіраўніцтва аб стварэнні беларускага рэўкама папярэднічаў іншы этап яго палітыкі па беларускім пытанні, на якім яна была падпарадкаваная пошуку новай „мірнай перадышкі". Гэту другую пасля Брэсцкага міру перадышку савецкае кіраўніцтва шукала менавіта ў адносінах з Польшчай, праяўляючы гатоўнасць даць за яе вялікую цану — тэрыторыю Беларусі аж да Бярэзіны і Дняпра, гэта значыць, амаль усю тую беларускую тэрыторыю, якая засталася па-за межамі РСФСР пасля абрэзкі ў студзені 1919 г. толькі што абвешчанай „першай" БССР. На працягу 1919 г. адпаведныя прапановы неаднаразова рабіліся ў ходзе сакрэтных перагавораў, якія ад імя савецкага ўрада вёў Юльян Мархлеўскі, а затым былі паўтораны адкрыта ў заявах Саўнаркама (СНК) і УЦВК. Ленін неаднаразова прызнаваў гэта пасля таго, як адпаведныя захады праваліліся. „Вырашэнне пытання аб Беларусі мы меркавалі не сілай зброі, а выключна толькі шляхам развіцця барацьбы ўнутры Польшчы", — казаў ён, напрыклад, у пачатку кастрычніка 1920 г.[4] Ён жа ясна называў і матыў такой палітыкі: ім была ўпэўненасць у тым, што „рабочыя і сяляне навучыліся самі вырашаць гэтыя граніцы" і што ў выніку іх барацьбы „польскім памешчыкам і капіталістам чужых зямель не ўтрымаць"[5]. Такім чынам, пытанне аб Беларусі задоўга да прыняцця рашэння аб аднаўленні БССР было пераўтворана ў сродак савецкай палітыкі на заходнім яе накірунку. Яно не было прынцыповым для савецкага ўрада. Таму, ацэньваючы гэтае рашэнне, мы мусім улічваць палітычную кан'юнктуру, якая склалася на момант яго прыняцця — у ліпені 1920 г., а па-другое — усведамляць магчымасць адыходу ад яго і вяртання да палітыкі 1919 — пачатку 1920 г. пры істотным змяненні гэтай кан'юнктуры. Прынцыповым быў толькі погляд на савецкую ўладу ў Расіі як на апору сусветнай рэвалюцыі.

А цяпер пяройдзем да разгляду таго самага рашэння Пленума ЦК РКП(б) ад 16 ліпеня 1920 г., якое прадвясціла другое нараджэнне БССР. Беларускія гісторыкі ў даследаванні гэтага пытання на працягу многіх гадоў карысталіся копіяй толькі аднаго фрагмента пратакола рашэнняў Пленума ЦК ад гэтай даты, таго, у якім фіксавалася рашэнне аб стварэнні беларускага рэўкама. Такі падыход не дазваляў убачыць усяго кантэксту, у якім было прынята гэтае рашэнне, і правільна зразумець яго значэнне. А яно знаходзілася ў непасрэднай сувязі з прынятым гэтым жа Пленумам прынцыповым рашэннем аб паходзе Чырво-

[4] В. И. Ленин, *Полное собрание сочинений*, т. 41, с. 320.
[5] Там жа, с. 139.

най Арміі ў Польшчу з мэтай яе саветызацыі і перанясення рэвалюцыі ў Германію. Рыхтуючыся да пленума, Ленін правёў апытанне членаў ЦК і відных польскіх камуністаў з мэтаю высветліць іх меркаванне наконт намераў паслаць Чырвоную Армію ў Польшчу. Адзін з апытаных, член ЦК РКП(б) і Рэўваенсавета Заходняга фронту Івар Смілга ў першым пункце сваёй запіскі ў ЦК прапанаваў: „Абвясціць Беларускую рэспубліку (пакуль in abstracto)" — абстрактна[6]. Дадатковую вагу гэтай прапанове надаваў факт, што Смілга, асоба, блізкая да Леніна, 25 мая 1920 г. рашэннем Палітбюро ЦК быў уведзены ў новы склад Бюро ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі і прызначаны яго старшынёй[7]. Такім чынам, у час наступлення Чырвонай Арміі на захад праз тэрыторыю Беларусі Смілга быў кіраўніком камуністычнай арганізацыі Літвы і Беларусі, яе куратарам ад ЦК РКП(б) і адначасова сувязным паміж ёю і камандаваннем Заходняга фронту.

Пратакол пленума і зацверджаныя ім тэзісы аб Польшчы сведчаць, што прынятыя рашэнні нацэльвалі партыю на разгортванне сусветнай рэвалюцыі і ставілі ёй на службу рэсурсы савецкай краіны. Першыя пытанні парадку дня былі звязаныя з адкрыццём 19 ліпеня II кангрэса Камінтэрна, 18-м па ліку стаяла пытанне аб адказе савецкага ўрада на ноту Керзана з яго прапановай аб перамір'і з Польшчай. Да гэтага пункта былі прыкладзены распрацаваныя Леніным тэзісы ЦК, якія прадугледжвалі стварэнне савецкай улады ў Польшчы, і толькі следам ішло пытанне аб стварэнні Беларускага рэўкама — тое самае, рашэнне па якім неаднаразова цытавалася беларускімі гісторыкамі. Тут гаварылася: „Оказать содействие белорусскому народу в создании белорусского ревкома, подчинив на ближайший период времени вопросы организации правительственной власти в пределах Белоруссии (у дакуменце — „Белоросии" — Р. Л.) военным потребностям фронта"[8]. Гэтае рашэнне стаяла побач з рашэннямі, абавязваўшымі партыйныя і савецкія органы мабілізаваць польскіх камуністаў на фронт, наладзіць „энергічнае садзеянне" румынскім камуністам, стварыць Галіцыйскі рэвалюцыйны камітэт (Галрэўкам) і г.д. Аляксею Рыкаву, Мікалаю Красцінскаму і Леаніду Красіну (апошняга пасылалі на перагаворы ў Англію) даручалася забяспечыць Красіна каштоўнасцямі і валютай для перадачы брытанскім камуністам, якім належала арганізаваць кампанію салідарнасці з Савецкай Расіяй. Найбольш сакрэтныя з прынятых рашэнняў не трапілі ў машынапісны варыянт пратакола і засталіся ў рукапісе. Адно з іх мела дачыненне да Літвы ў межах ліпеньскай дамовы 1920 г., а значыць і да Беларусі: „По-

[6] *Польско-советская война 1919-1920 гг.* (далей: ПСВ), ч. 1, Москва 1994, с. 14.
[7] Российский государственный архив социально-политической истории (далей: РГАСПИ), ф. 17, оп. 3, д. 82, л. 3.
[8] РГАСПИ, ф. 17, оп. 2, д. 31, л. 2.

ручить Оргбюро [ЦК] оказывать всемерное содействие временной власти в оккупированной части Литвы как работниками, так и деньгами, и проч."[9]. У гэтыя дні ў савецкіх кіраўнікоў настолькі закружылася галава ад поспехаў на польскім фронце, што яны пачалі гаварыць не толькі аб саветызацыі Польшчы і Літвы, але і аб падштурхоўванні рэвалюцыі ў Італіі, аб саветызацыі Венгрыі, Чэхіі, Румыніі[10].

Такім чынам, Беларускай савецкай рэспубліцы, хоць і абстрактнай з пункту гледжання юрыдычнай формы, адводзілася зусім не асбтрактная роля стратэгічнага плацдарма для шырокага наступлення ў Еўропу з мэтай саветызацыі еўрапейскіх краін. Для нарошчвання гэтага наступлення Ленін намагаўся выкарыстаць антыпольскія настроі і адпаведны паўстанцкі рух на акупіраванай тэрыторыі, аб якім ведаў з шэрагу крыніц, у прыватнасці, з данясенняў РВС Заходняга фронту. Аднак з тых жа данясенняў РВС[11] яму было вядома, што гэты рух суправаджаецца, як гаварылася ў адным з дакументаў, імкненнем да незалежнасці „сярод дробнабуржуазных элементаў". Улічваючы гэтае імкненне, Палітбюро ЦК РКП(б) яшчэ 25 мая ў блоку рашэнняў па беларускіх пытаннях прыняло прапанову Чычэрына пачаць перамовы з „белым урадам Беларусі" і вяло іх на працягу лета, дакладней, імітавала сапраўдныя перамовы[12]. Такім чынам, рашэнне аб стварэнні Беларускага рэўкама адпавядала як стратэгічным задачам наступлення ў Еўропу, забяспечваючы для яго спрыяльнае прадполле і надзейны тыл, так і палітычным задачам, ствараючы патэнцыяльную супрацьвагу ўраду БНР, які ўзначальваў Вацлаў Ластоўскі.

30 ліпеня на пасяджэнні Бюро Мінскага губрэўкама адпаведна з рашэннямі Палітбюро ЦК РКП(б) было прынята рашэнне аб стварэнні Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Беларускай савецкай рэспублікі. У выніку праведзеных ЦК КПЛіБ перагавораў у яго склад, як ужо адзначалася, увайшлі акрамя, літбелаўскіх камуністаў, прадстаўнікі БКА Усевалад Ігнатоўскі, Бунда Арон Вайштэйн, намячалася ўключэнне і А. Трафімава ад беларускіх эсэраў. Паколькі эсэры не згадзіліся з тэрытарыяльным абсягам будучай Беларускай рэспублікі, характарам яе ўрада і яе аграрнай палітыкі, то яна 31 ліпеня была абвешчана без іх. У жніўні 1920 г. ўлада ВРК распаўсюджвалася на 21 павет Мінскай і Гродзенскай губерняў[13].

[9] РГАСПИ, ф. 17, оп. 2, д. 31, л. 29-29 об.

[10] В. И. Ленин, *Неизвестные документы. 1891-1922*, Москва 1999, с. 357; *Большевисткое руководство. Переписка. 1912-1927 гг.*, Москва 1996, с. 148.

[11] ПСВ, ч. 1, с. 67-69.

[12] Р. Лазько, *Беларуска-савецкія перагаворы 1920 г.*, [у:] *Białoruś w XX stuleciu*, Toruń 2007, s. 325-336.

[13] П. Т. Петриков, *Ревкомы Белоруссии*, Мінск 1975, с. 79, заўв. 131.

Беларускія гісторыкі ўжо звярталі ўвагу на характар ВРК як часовага надзвычайнага органа ўлады на вызваленай тэрыторыі і на яго асаблівасць як шматпартыйнага органа[14], аднак ні з таго, ні з другога факта належных высноў не зрабілі. Што датычыць апошняга — шматпартыйнасці, то яе значэнне нельга перабольшваць. Гэта была абмежаваная і кіраваная бальшавіцкім цэнтрам шматпартыйнасць, неабходная для ўмацавання сацыяльнай і палітычнай базы савецкай улады шляхам надання ёй мясцовага аблічча. Вопыт такой „дазволенай" шматпартыйнасці ўжо быў набыты на Украіне, дзе бальшавікамі былі дапушчаны да ўлады мясцовыя левыя эсэры — партыя барацьбістаў, і аказаўся эфектыўным: лягчэй стала „выцягваць" хлеб для Чырвонай Арміі і атрымліваць папаўненні. Цяпер гэты вопыт пераносіўся ў Беларусь.

Надзвычайны характар ВРК як органа ўлады патрабуе больш грунтоўнага каментару, паколькі гэты стан фармальна найвышэйшага органа ўлады ў Беларусі зацягнуўся на няпоўных пяць месяцаў і моцна абмяжоўваў яе правасуб'ектнасць у ходзе мірных перамоваў з Польшчай. Статус рэвалюцыйных камітэтаў, якім быў і ВРК БССР, рэгуляваўся „Палажэннем УЦВК і Савета рабоча-сялянскай абароны аб рэвалюцыйных камітэтах" ад 24 кастрычніка 1919 г. Адпаведна з гэтым „Палажэннем", рэвалюцыйныя камітэты вызваленых ад непрыяцеля мясцовасцей ствараліся вайсковымі Рэўваенсаветамі пры ўдзеле мясцовых органаў улады. Яны падпарадкоўваліся непасрэдна стварыўшаму іх рэўваенсавету і адначасова „цэнтральнай савецкай уладзе" праз народныя камісарыяты, атрымлівалі ад іх „цыркулярныя распараджэнні" па пытаннях сваёй практычнай дзейнасці і фінансаваліся імі[15]. У святле гэтага палажэння відавочна, што ВРК БССР быў надзвычайным органам *расійскай* улады на тэрыторыі Беларусі, для якога першай вышэйшай інстанцыяй быў Рэўваенсавет Заходняга фронту, прымаўшы ўдзел у яго стварэнні[16]. Гэтае меркаванне пацвярджаецца і тымі адносінамі падпарадкавання ВРК БССР Рэўваенсавету Заходняга фронту, якія рэальна склаліся паміж імі. Названае „Палажэнне" рэгулявала і парадак згортвання дзейнасці рэўкамаў. „Пры далейшым прасоўванні Чырвонай Арміі і пры стварэнні магчымасці для нармальнай пабудовы мясцовых органаў улады, — гаварылася ў яго § 5, — пастановай цэнтральнай

[14] Р. П. Платонов, Н. С. Сташкевич, *К вопросу о становлении белорусской национальной государственности*, [у:] *Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции*, ч. 2, Гомель 1993, с. 187.

[15] *Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению советской власти...*, с. 35.

[16] Як тая інстанцыя, што стварыла Мінскі губрэўкам. Гл.: *Борьба за советскую власть в Белоруссии. Сб. док. и материалов в двух томах*, т. 2, Мінск 1971, с. 308, 316, 414-415; П. Т. Петриков, *Ревкомы Белоруссии*, с. 68.

улады (падкр. намі — Р. Л.) у мясцовасці, вызваленай ад непрыяцеля, прызначаюцца выбары на з'езды Саветаў або ў Саветы, выканаўчым камітэтам якіх пасля іх выбрання рэвалюцыйныя камітэты перадаюць усе свае паўнамоцтвы, маёмасць і справы"[17].

Маючы моцных канкурэнтаў у выглядзе партыі беларускіх эсэраў унутры краіны і ўрада БНР за мяжой, ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі мусіў быць зацікаўленым у стварэнні сталых агульнабеларускіх органаў улады. Для гэтага неабходна было правесці выбары ў мясцовыя саветы і ў агульнабеларускі Савет рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. З даступных нам дакументаў відаць, што на працягу жніўня — верасня 1920 г. ВРК БССР інтэнсіўна займаўся падрыхтоўкай выбараў. На сваім пасяджэнні 18 жніўня ён абмеркаваў пытанне „Выбары ў Мінскі савет і з'езд Саветаў Рэспублікі". Першыя тры пункты прынятага рашэння рэгулявалі парадак стварэння выбарчых камісій і правядзення выбараў у Мінскі савет. А ў пункце 4-м гаварылася наступнае: „Адкрыццё з'езда Саветаў Рэспублікі прызначаецца паміж 15-м кастрычнікам і 1 лістапада гэтага года. Прычым да моманту [яго] склікання паўсюдна павінны быць праведзены павятовыя і валасныя з'езды"[18]. Прыведзеная фармулёўка сведчыць, што прынцыповае рашэнне аб правядзенні выбараў на ўсебеларускі з'езд саветаў, хутчэй за ўсё, было прынятае раней, а на пасяджэнні 18 жніўня быў толькі ўстаноўлены прыкладны тэрмін яго склікання. Аднак праз некалькі тыдняў, 14 верасня 1920 г., ВРК БССР давялося тэрмінова прымаць рашэнне аб скасаванні выбараў на Усебеларускі з'езд Саветаў адпаведна з распараджэннем Рэўваенсавета Заходняга фронту, дасланым Юзэфам Унш-ліхтам[19]. Матывы гэтага распараджэння ў вядомых нам дакументах прама не ўказаны. Першае, што прыходзіць на думку — гэта пагаршэнне сітуацыі на фронце пасля паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай. Аднак на момант адсылкі Рэўваенсаветам свайго распараджэння ў Мінск, а затым і рашэння ВРК БССР, паражэнне на Вісле было ўжо адносна даўнім і ўсім вядомым фактам. Да таго часу, па яго гарачых слядах, яно не выклікала такой панічнай рэакцыі, а вераснёўскае паражэнне на Нёмане яшчэ было наперадзе. Таму трэба шукаць іншыя прычыны. На нашу думку, яны знаходзіліся ў палітычнай сферы. Прызначыўшы выбары, ВРК БССР перавысіў свае паўнамоцтвы, што было дастатковай падставай для асуджэння яго рашэння. Акрамя таго, яно выклікала крытыку з боку польскіх камуністаў, працаваўшых у паліт-

[17] Там жа.

[18] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 8, воп. 1, спр. 10, л. 266.

[19] НАРБ, ф. 8, воп. 1, спр. 10, л. 308; Государственный архив Российской Федерации (далей: ГАРФ), ф. 1235, оп. 95, д. 275, л. 22.

органах Заходняга фронту[20] і меўшых свае уяўленні аб тэрыторыі будучай Польскай савецкай рэспублікі. Аднак найбольш важнай прычынай быў паварот у палітыцы Савецкай Расіі ад дыктату з пазіцыі сілы на перамовах з Польшчай, якую яна займала на іх першым, мінскім этапе, да „палітыкі згодніцкага міру". Рашэнне аб гэтым павароце з адпаведнай фармулёўкай Палітбюро ЦК РКП(б) прыняло 1 верасня 1920 г.[21] пад уплывам цяжкага паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай і няўдач у ваенных дзеяннях супраць войск генерала Пятра Урангеля. Такі паварот прадугледжваў саступку Польшчы часткі тэрыторыі Беларусі да лініі рэк Шчара і Ясельда.

Аргументам на карысць нашай трактоўкі гэтага пытання з'яўляецца рашэнне ВРК БССР ад той жа даты (14 верасня) аб адтэрміноўцы выбараў у заходніх паветах Беларусі на няпэўны тэрмін з адначасовым пацвярджэннем іх правядзення ў чатырох паветах Міншчыны (Мінскім, Барысаўскім, Бабруйскім, Ігуменскім) і ў Мінскі гарадскі савет[22]. Такім чынам, у момант, калі пачынаўся вырашальны этап мірных перагавораў з Польшчай, савецкая Беларусь заставалася без сваіх прадстаўнічых органаў і юрыдычна нават і не магла прэтэндаваць на ўдзел у іх у якой-небудзь хоць бы фармальна самастойнай ролі.

На мінскім этапе перамоваў Беларусь фігурыравала толькі ў якасці аб'екта палітыкі дзвюх дзяржаў — Савецкай Расіі і Польшчы — і пераважна ў палемічным ключы. 19 жніўня кіраўнік савецкай дэлегацыі Караль Данішэўскі ад імя ўрада прадставіў дэкларацыю, у якой, між іншым, сцвярджалася, што палітыка РСФСР быццам бы грунтуецца на прынцыпе прызнання права народаў на самавызначэнне. Старшыня польскай дэлегацыі Ян Домбскі парыраваў гэтае сцвярджэнне спасылкай на ноту Саўнаркама РСФСР ад 28 студзеня 1920 г., сэнс якой заключаўся якраз у тым, што савецкі ўрад, насуперак прынцыпу самавызначэння, гатовы быў саступіць Польшчы тэрыторыю Беларусі, якая ляжала на захад ад лініі Дрыса — Дзісна — Полацк — Барысаў — Парэчча — Пціч. Пярэчыла прынцыпу самавызначэння, гаварыў Домбскі, і перадача Літве беларускай тэрыторыі паводле дамовы ад 12 ліпеня 1920 г.[23] Савецкую Беларусь Домбскі называў аўтаномнай адзінкай у складзе РСФСР, створанай не мясцовым насельніцтвам, а ўладамі той жа Савецкай Расіі[24]. Данішэўскі галаслоўна абараняўся, сцвярджаючы аб прынцыповым і бескарыслівым характары палітыкі савецкага ўра-

[20] Гл.: ПСВ, ч. 2, с. 42.
[21] ПСВ, ч. 2, с. 8-9.
[22] НАРБ, ф. 8, воп. 1, спр. 10, л. 308.
[23] Archiwum Akt Nowych, sygn. 662A, l. 19, 95.
[24] *Документы и материалы по истории советско-польских отношений* (далей: ДМИСПО), Москва 1965, т. 3: *Апрель 1920 г. — март 1921 г.*, с. 318-319, 326-327.

да адносна Беларусі і фармальна самастойнай на той момант Украінскай рэспублікі. Гэтыя аргументы, натуральна, былі няздольныя пераканаць яго суразмоўцаў.

Але ўжо на мінскім этапе перамоваў іх удзельнікі знайшлі метад, які прынёс плён на іх наступным, рыжскім этапе — нефармальныя закулісныя кантакты прадстаўнікоў савецкай і польскай дэлегацый. Менавіта на такой сустрэчы паміж Данішэўскім і членам польскай дэлегацыі пэпэсаўцам Норбертам Барліцкім, з удзелам Карла Радэка, была названая Беларусь як прадмет магчымага пагаднення паміж РСФСР і Польшчай[25]. Кіраўнікі дэлегацый праінфармавалі кіруючыя інстанцыі аб гэтай перспектыве: Домбскі ўказваў на яе ў сваім выступленні на пасяджэнні Рады абароны дзяржавы 11 верасня[26], Данішэўскі тэлеграфаваў Чычэрыну, а той паведаміў Леніну і тым самым Палітбюро ЦК РКП(б). Пры гэтым Чычэрын звязваў магчымасць дасягнення міру з Польшчай менавіта з уступленнем РСФСР на шлях тых самых саступак ёй, якія прапанаваліся „польскімі левымі" праз Данішэўскага[27]. 1 верасня Палітбюро ЦК РКП(б) ухваліла гэтую ідэю, адначасова прыняўшы рашэнне аб пераносе перамоваў на нейтральную тэрыторыю і змене складу савецкай дэлегацыі[28].

Пытанне аб удзеле прадстаўніка савецкай Беларусі ў мірных перамовах узнікла на іх рыжскім этапе, пры гэтым яно было пастаўлена не беларускім бокам, а Чычэрыным[29], які мусіў такім чынам рэагаваць на дыпламатычную актыўнасць урада БНР вакол мірнай канферэнцыі. Урад Ластоўскага яшчэ перад пачаткам мінскага этапу перамоваў звярнуўся да ўрадаў РСФСР і Польшчы з патрабаваннем допуску да ўдзелу ў іх[30], аднак тады яно было праігнаравана. Урад БНР працягваў настойваць на сваім патрабаванні, прымаў захады, каб прыцягнуць увагу вялікіх дзяржаў і міжнароднай супольнасці да пагрозы падзелу Беларусі і магчымых яго наступствах, небяспечных для міру ў Еўропе. 7 верасня Ластоўскі зноў паслаў ноту наркаму Чычэрыну з патрабаваннем удзелу ў мірнай карферэнцыі[31]. У Адольфа Іофэ, прызначанага кіраўніком савецкай дэлегацыі на перамовах з Польшчай[32], склалася перакананне, што ўрад Ластоўскага падкуплены палякамі, і што ён пабяцаў саступіць ім чатыры ці пяць паветаў Беларусі, за што заручыўся

[25] ДМИСПО, т. 3, с. 379-380; ПСВ, ч. 2, с. 4.
[26] ДМИСПО, т. 3, с. 380.
[27] ПСВ, ч. 2, с. 4-5.
[28] ПСВ, ч. 2, с. 8-9.
[29] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 109, л. 18 адв.
[30] НАРБ, ф. 325, воп. 1, спр. 14, л. 60.
[31] РГАСПИ, ф. 5. оп. 1, д. 2001, л. 24.
[32] Іофэ толькі што паспяхова завяршыў перамовы аб міры з Латвіяй.

іх падтрымкай свайго патрабавання аб удзеле ў перамовах[33]. Чычэрын выказваў не настолькі песімістычную з пункту гледжання інтарэсаў РСФСР ацэнку: „Сумняваюся, каб палякі энергічна падтрымлівалі Ластоўскага, бо, як можна бачыць, праграма буферных дзяржаў страціла свой крэдыт”[34]. Тым не менш, савецкая дыпламатыя прымала прэвентыўныя захады для нейтралізацыі дыпламатычнай дзейнасці ўрада Ластоўскага ў сувязі з Рыжскай мірнай канферэнцыяй і, перш за ўсё, для супрацьдзеяння верагоднаму польска-беларускаму супрацоўніцтву. У якасці сродку для рэалізацыі гэтай мэты якраз і быў патрэбны беларускі савецкі ўрад, нават і такі фіктыўны, якім быў ВРК БССР. Ідэя яго выкарыстання ў такой ролі ўжо існавала перад мінскім этапам перамоваў. Яе намеціў Іофэ ў тэлеграме з Рыгі ад 14 жніўня, у якой паведамляў аб сваёй размове з прадстаўніком Літвы ў Латвіі Довасам Заунісам: „Я ўказаў яму, што Польшча ўжо гаворыць аб перадачы намі Літве беларускай тэрыторыі і, напэўна, паспрабуе супрацьпаставіць [нам] які-небудзь беларускі ўрад, які апратэстуе руска-літоўскую дамову, тады мы зможам вылучыць пацвярджэнне гэтай дамовы з боку сапраўднага беларускага ўрада, які сядзіць у Мінску. Але для гэтага трэба, каб Літва шчыра трымалася за нас (...)”[35]. І вось у верасні, у сувязі з дамаганнямі ўрада БНР патрапіць на польска-савецкія мірныя перагаворы, надышоў час для выхаду на дыпламатычную сцэну і прадстаўнікоў савецкай Беларусі (як хутка высветлілася, на самую сцэну яны не трапілі, заставаліся ўвесь час за ёю).

8 верасня, літаральна на наступны дзень пасля адпраўкі ўрадам Ластоўскага ноты Чычэрыну, Цэнтральнае бюро КП(б)Б на сваім пасяджэнні разгледзела пытанне: „Аб прадстаўніку на мірную канферэнцыю. Пастанавілі. Прымаючы прапанову наркама т. Чычэрына, ССРБ дэлегіруе[36] свайго прадстаўніка на мірную канферэнцыю ў асобе т. Ігнатоўскага, якому падрыхтаваць шырокі мандат”. Чарвякову даручалася падрыхтаваць матэрыялы па гісторыі і эканоміцы Беларусі для выкарыстання на канферэнцыі[37]. З гэтай пастановы вынікала, што Ігнатоўскаму даручалася прадстаўляць Савецкую Беларусь у якасці суб’екта перагавораў непасрэдна. Але праз дзень, 10 верасня, ужо ВРК БССР прыняў вядомую пастанову „Аб удзеле ў мірных перагаворах”, якой прадстаўніцтва Беларусі на мірных перамовах перадавалася Расійскай Федэрацыі: „Рэспубліка Беларусі выдае РСФСР самы шырокі мандат

[33] РГАСПИ, ф. 5, оп. 1, д. 2001, л. 24, 32.
[34] РГАСПИ, ф. 5, оп. 1, д. 2000, л. 5.
[35] РГАСПИ, ф. 5, оп. 1, д. 2001, л. 25.
[36] У пратаколе літаральна так: „Прымаючы прапанову т. Чычэрына, НарКом ССРБ дэлегіруе (...)”.
[37] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 109, л. 18 адв.

на вядзенне мірных перагавораў з Польшчай па пытанні, галоўным чынам, аб вызначэнні межаў Беларусі". Прычыну гэтага павароту мы звязваем з тым жа рашэннем Палітбюро ЦК РКП аб пераходзе „да згодніцкага міру" з Польшчай, якому непасрэдны ўдзел ССРБ у перамовах мог перашкодзіць. Разам з тым, другім пунктам той жа пастановы ВРК пацвярджалася прызначэнне Ігнатоўскага прадстаўніком ССРБ, прычым, вызначалася і яго задача: „абарона інтарэсаў самастойнасці Рэспублікі Беларусі"[38]. У святле першага пункту пастановы відавочна, што выканаць гэту задачу Ігнатоўскі не меў магчымасці.

Тым часам пад уплывам актывізацыі ўрада БНР Чычэрын праз Смілгу прыспешваў прыезд прадстаўніка ССРБ — менавіта дзеля таго, каб „супрацьпаставіць Савецкую Беларусь намерам Ластоўскага"[39]. Гэтае распараджэнне прыйшло ў Мінск у той самы дзень (14 верасня), калі ВРК БССР па патрабаванні РВС Заходняга фронту скасаваў выбары на Усебеларускі з'езд саветаў і ў саветы заходніх паветаў, а Чарвякову было даручана правесці перамовы з Рэўваенсаветам для высвятлення сітуацыі[40]. Вынікі перамоваў, відавочна, былі такія, што прымусілі ВРК у адказ на патрабаванне Чычэрына не толькі прыспешыць выезд у Рыгу беларускага прадстаўніка, але і замяніць Ігнатоўскага Чарвяковым. Яму даваліся „полномочия" без удакладнення, у якіх[41], ва ўсялякім разе, гаворкі аб абароне самастойнасці Беларусі ўжо не было. Чарвякоў абавязаўся праз кожныя тры дні паведамляць ВРК БССР праз кур'ера аб ходзе перамоваў, а рэўкаму даручалася пасылаць яму неабходныя матэрыялы[42]. Гэтае рашэнне было прынята 16 верасня, а 18 верасня Чарвякоў ужо выехаў у Рыгу.

Абедзве дэлегацыі — савецкая і польская — прыехалі ў Рыгу, маючы за плячыма стомленыя ад вайны і прагнуўшыя міру краіны. Абедзве мелі дырэктывы сваіх вышэйшых кіруючых органаў, якія зыходзілі з цвёрдага жадання не дапусціць яшчэ адной ваеннай зімы, нёсшай з сабой далейшае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі, рост сацыяльнай напружанасці і палітычнай нестабільнасці з непрадбачанымі наступствамі. Аднак пры наяўнасці з абодвух бакоў прычын, прымушаўшых іх дзейнічаць у накірунку заключэння міру, існавалі істотныя адрозненні ў іх пазіцыі. Пазіцыя Савецкай Расіі была слабейшай, паколькі ваенныя дзеянні вяліся на савецкай тэрыторыі, у канцы верасня польскія

[38] *Знешняя палітыка Беларусі: Зб. дак. і матэрыялаў*, т. 1: *(1917-1922 гг.)*, Мінск 1997, с. 195.

[39] *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4 т.*, т. 1: *1 жніўня 1914 г. — 18 сакавіка 1921 г.*, ч. 2: *3 студз. 1920 г. — 18 сакавіка 1921 г.*, Мінск 2008, с. 158.

[40] Гл.: НАРБ, ф. 8, воп. 1, спр. 10, л. 308.

[41] ГАРФ, ф. 1235, оп. 95, спр. 279, л. 23.

[42] Там жа.

войскі выйшлі на лінію старых нямецкіх акопаў, захапілі Ліду, Баранавічы, Пінск і захоўвалі ініцыятыву. Але галоўная слабасць Савецкай Расіі мела ваенна-палітычны характар: яна мусіла весці барацьбу на двух франтах, прычым другі — унутраны ўрангелеўскі фронт — быў больш небяспечны, бо паражэнне на ім азначала гібель савецкай улады. Яшчэ 5 жніўня пленум ЦК прызнаў гэты фронт галоўным[43], туды перакідваліся сілы з Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў. Нягледзячы на прынятыя захады, сітуацыя на Поўдні заставалася цяжкая. Існавала пагроза зрыву рашэння Палітбюро ЦК ад 1 верасня, патрабаваўшага ад ваеннага ведамства ўзяць Крым да пачатку зімы[44]. Ленін моцна нерваваўся з гэтай прычыны[45] і кінуў увесь свой аўтарытэт на тое, каб згарнуць польскі фронт. Ён адстойваў і адстаяў гэтую лінію на IX партыйнай канферэнцыі 22 верасня 1920 г., супакоіўшы цвёрдых прыхільнікаў сусветнай рэвалюцыі тым, што мір з Польшчай заключаецца ненадоўга, Савецкая Расія будзе вяртацца да наступальнай палітыкі „яшчэ і яшчэ раз", „пакуль мы ўсіх не разаб'ем да канца"[46].

23 верасня УЦВК РСФСР па дакладзе Леніна прыняў заяву аб асновах адносін з Польшчай — дакумент, сапраўды разлічаны на тых, хто ўмее чытаць. Ён пачынаўся з выказвання клопату савецкага ўрада аб недапушчэнні аднолькава цяжкай для абодвух бакоў зімовай кампаніі, затым ішла звычайная для яго рыторыка аб самавызначэнні народаў спрэчных тэрыторый як аб прынцыпе адносін і пагадненняў РСФСР з суседзямі, а праз абзац змяшчалася заява аб адмове савецкага ўрада ад гэтага самага прынцыпу ў адносінах да Украіны і Беларусі дзеля таго, каб адкрыць магчымасць для пагаднення з Польшчай, якое дазволіць пазбегнуць зімовай кампаніі. У аснову гэтага пагаднення было прапанавана пакласці дзве ідэі: РСФСР адмаўляецца ад дыскрымінаваўшых Польшчу патрабаванняў, вылучаных на мінскім этапе перагавораў; дзве дзяржавы прызнаюць мяжу паміж РСФСР і Польшчай па лініі, „якая праходзіць значна далей на ўсход ад мяжы, устаноўленай Вярхоўнай Радай Антанты 3 снежня 1919 г." — так званай лініі Керзана[47]. Наколькі далей на ўсход мусіла ісці пажаданая лінія, указвалася ў прапанове Галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Рэспублікі Сяргея Каменева, якая была прадстаўлена пленуму ЦК РКП(б) 23 верасня і зацверджана ім. Гэта была лінія, якая ішла ад мяжы з Літвой па рацэ Шчара, Агінскага канале, рэках Ясельда і Стыр, далей па былой дзяржаў-

[43] „Известия ЦК КПСС", 1991, № 2, с. 120.
[44] ПСВ, ч. 2, с. 8.
[45] В. И. Ленин, *Полное собрание сочинений*, т. 51, с. 292-293, 295.
[46] *Политбюро ЦК РКП(б) — ВКП(б) и Коминтерн*, Москва 2004, с. 66.
[47] *Документы внешней политики СССР*, Москва 1959, т. 3, с. 204-206.

най мяжы з Аўстра-Венгрыяй[48]. Ад імя пленума ЦК РКП(б) Іофэ была адпраўлена адпаведная тэлеграма[49].

Дэкларацыя УЦВК, 24 верасня апублікаваная ў Рызе, у пэўным сэнсе стала падарункам для польскай дэлегацыі. Справа ў тым, што яна прыехала ў Рыгу, маючы інструкцыю Рады абароны дзяржавы ад 11 верасня, якая настройвала яе на кампрамісны лад, дазваляючы ісці дзеля заключэння міру на прызнанне не толькі Савецкай Расіі, што было непазбежна, але і Савецкай Украіны, хаця і не ў прамой форме, а ў форме згоды на ўжыванне іх назваў у тэксце дамовы[50]. Не спадзеючыся на гэтую саступку, савецкая дэлегацыя мусіла не настойваць на прызнанні Савецкай Украіны, не кажучы ўжо пра ССРБ, працэс канстытуіравання якой быў спынены. Аднак і польская Рада абароны дзяржавы, са свайго боку, памылілася, палічыўшы, што якраз прызнанне Польшчай абедзвюх рэспублік „з'яўляецца асноўнай мэтай супрацьлеглага боку". Зыходзячы з гэтай памылкі, польская дэлегацыя абавязана была пайсці на прызнанне савецкіх рэспублік толькі пры ўмове, што савецкі бок прызнае прымальную для Польшчы мяжу і адмовіцца ад умяшання ў справы тэрыторый, якія знаходзяцца на захад ад яе, уключаючы і адносіны Польшчы з дзяржавамі, узнікшымі на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай[51]. У якасці задавальняючай Польшчу мяжы дэлегацыя мусіла прапаноўваць савецкаму боку лінію, пакідаўшую ў складзе Польшчы чыгунку Роўна — Сарны — Лунінец — Баранавічы, у той час як савецкі бок спадзяваўся пакінуць яе сабе. Пры гэтым пры абмеркаванні інструкцыі для польскай дэлегацыі міністр замежных спраў Яўстафій Сапега назваў зацверджаную лінію „мінімальным варыянтам"[52]. Узаемна недакладнае разуменне мэтаў супрацьлеглага боку, разам з даўнім узаемным недаверам, значна ўскладняла перамовы.

Выпраўляць слабасць савецкай палітыкі, закладзеную ў дырэктывах, атрыманых дэлегацыяй, узяўся на сваю рызыку яе кіраўнік Адольф Іофэ. Разлічваючы на свае ўплывы ў савецкім кіраўніцтве (быў чалавекам блізкім да Троцкага), на свой вопыт і на сваю славу міратворцы, ён па сваёй ініцыятыве[53] ўключыў у праект дамовы (рэдкі выпадак у дыпламатычнай практыцы) артыкулы, паводле якіх урад РСФСР быццам бы настойваў на прызнанні Польшчай савецкіх рэспублік[54]. 28 верас-

[48] В. И. Ленин, *Полное собрание сочинений*, т. 51, с. 285-286; „Известия ЦК КПСС", 1991, № 4, с. 149-150.
[49] В. И. Ленин, *Полное собрание сочинений*, т. 51, с. 286.
[50] ДМИСПО, т. 3, с. 388.
[51] ДМИСПО, т. 3, с. 387-388.
[52] ДМИСПО, т. 3, с. 386.
[53] Гл.: ПСВ, ч. 2, с. 66, 84.
[54] ДМИСПО, т. 3, с. 402-407.

ня[55] савецкі праект быў прадстаўлены на чарговым пленарным пасяджэнні польска-савецкай канферэнцыі. За дапушчанае самаўпраўства Іофэ тут жа атрымаў вымову ад Чычэрына[56], але справа была зроблена: пытанне аб прызнанні савецкіх рэспублік Беларусі і Украіны трапіла на стол польска-савецкіх перамоваў.

Як мы ўжо зразумелі, само па сабе гэтае пытанне не было прынцыпова важным ні для Польшчы, ні для Савецкай Расіі. Аднак яго кароткае абмеркаванне на рыжскай канферэнцыі дазваляе зразумець існаванне ў прынцыпе альтэрнатывы вядомаму трагічнаму для Беларусі выніку рыжскіх перагавораў — яе падзелу. Гэтая альтэрнатыва выявілася ў ходзе дыскусіі Іофэ і Домбскага з удзелам сакратароў дэлегацый Івана Лоранца і Аляксандра Ладася, на таемных сустрэчах 1 і 2 кастрычніка. Пачатак ёй быў пакладзены на прайшоўшым папярэдне пленарным пасяджэнні. Як высветлілася, Домбскі ўважліва чытаў савецкія дакументы і адразу звярнуў увагу на супярэчнасць праекта дамовы, прапанаванага Іофэ, дэкларацыі УЦВК. Насуперак дэкларацыі ў праекце фактычна было прапанавана Польшчы прызнаць той палітычны лад, які Савецкая Расія ўстанавіла ў Украіне і Беларусі. „У сапраўднасці гэта савецкая Беларусь не мае ніякіх аб'ектыўных рысаў самастойнасці і дзяржаўнай незалежнасці, — казаў Домбскі. — Сумнеўна, што іх мае і савецкая Украіна"[57]. Далей ён сцвярджаў, што Польская Рэспубліка, не чакаючы ініцыятывы Расіі, ужо прызнала (?! — Р. Л.) незалежнасць Літвы, Украіны і Беларусі (у выпадку з Беларуссю, відавочна, мелася на ўвазе фактычнае прызнанне БНР), а вось Савецкая Расія „не дала рэальных гарантый незалежнасці Беларусі і Украіны, такіх, як вызначэнне іх усходніх і (апаведна — Р. Л.) паўночных межаў, свабоднага склікання — пасля выхаду расійскіх войск — канстытуцыйных сходаў гэтых краін, выбраных на аснове роўных, тайных, усеагульных, непасрэдных, прапарцыянальных выбараў, такой, як спыненне прадстаўніцтва гэтых краін праз Расію"[58]. Іофэ, не міргнуўшы вокам, заявіў, што гатовы вярнуцца да пазіцыі, выкладзенай у дэкларацыі УЦВК, а свой праект разглядае толькі як падставу для дыскусіі.

Тая самая беларуская альтэрнатыва, аб якой мы гаварылі вышэй, усплыла на сакрэтным пасяджэнні кіраўнікоў і сакратароў дэлегацый позна ўвечары 1 кастрычніка. Іофэ настойваў на тым, што ўпамінанне пра Украіну і Беларусь не можа знікнуць з дамовы, бо Савецкая Расія ўжо звязаная абавязацельствамі па гэтых пытаннях і не можа ахвяраваць

[55] Домбскі сцвярджае, што 29 верасня. J. Dąbski, *Pokój ryski. Wspomnienia, pertraktacje, tajne układy z Joffem, listy*, Warszawa 1931, s. 99-100.
[56] ПСВ, ч. 2, с. 8.
[57] J. Dąbski, *Pokój ryski...*, s. 100.
[58] Там жа

сваім прэстыжам, у прыватнасці, *перад англійскім пралетарыятам* (sic!). Што датычыць Беларусі, заявіў Іофэ зусім цынічна, то, „калі Польшча хоча, яны (савецкі бок — Р. Л.) могуць паклапаціцца наконт дэлегацыі беларускага ўрада, якая дапоўніць цяперашнюю расійска-ўкраінскую дэлегацыю. Аднак ён мяркуе, што для Польшчы выгадней, каб такой дэлегацыі не было і каб не было мандатаў ад Беларусі"[59]. Відаць, гэты аргумент пераканаў Домбскага, і ён згадзіўся перайсці да абмеркавання пытання аб лініі мяжы, якую належала зафіксаваць у прэлімінарнай дамове. Тут і была прадстаўлена лінія, вызначаная Радай абароны дзяржавы 11 верасня, лінія, якая аддавала Польшчы чыгунку Роўна — Лунінец — Баранавічы, і якую Іофэ не мог прыняць, не атрымаўшы новых інструкцый. Ён спрабаваў аспрэчваць яе як не адпавядаючую этнаграфічнаму прынцыпу, але атрымаў у адказ: або гэтая мяжа, або сапраўдная незалежнасць усёй Беларусі і вывад савецкіх войск за яе ўсходнюю мяжу[60], а польскіх адпаведна — за лінію Керзана.

Гэты эпізод перагавораў, даўно вядомы ў польскай гістарыяграфіі з польскіх крыніц, цяпер можна пацвердзіць і савецкімі дакументальнымі крыніцамі. Ён адлюстраваны ў адным з лістоў Чарвякова з Рыгі, апублікаваных яшчэ ў 1991 г.[61], і ў да гэтага часу непублікаваным тэлеграфным паведамленні Іофэ Чычэрыну, з копіямі Леніну, Троцкаму, Красцінскаму, аб яго сакрэтнай гутарцы з Домбскім. Адпаведна паведамленню, адпраўленаму ўначы 2 кастрычніка, Домбскі заявіў, што калі РСФСР не згодзіцца перадаць Польшчы чыгунку Роўна — Сарны — Лунінец — Баранавічы — Ліда, „то застаецца для дыскусіі яшчэ толькі адна прапанова: устанаўленне ўсходняй мяжы Беларусі і заходняй [яе граніцы], прыблізна па лініі Керзана, вывад намі і палякамі сваіх войск на 25 вёрст [ад гэтых граніц] і самавызначэнне Беларусі, гэта значыць, стварэнне буфера паміж намі і Польшчай"[62]. Іофэ запрошваў указанняў.

Палітбюро ў той жа дзень абмеркавала польскія патрабаванні і дало згоду на першую альтэрнатыву — саступку на карысць Польшчы жаданай ёю чыгункі з ахоўнай тэрыторыяй на ўсход ад яе, але з умовай, што дамова будзе падпісаная як найхутчэй, прыкладна праз тры дні. З кастрычніка Чычэрын паслаў Іофэ адпаведную дырэктыву[63]. Не паспеў, аднак, ён адправіць яе, як Іофэ прыслаў чарговае паведамленне аб новай таемнай сустрэчы з Домбскім, якая адбылася ўвечары 2 кастрычніка. На яе Домбскі прыйшоў з новымі, павялічанымі патрабаваннямі, прынятымі на пасяджэнні польскай дэлегацыі, абмеркаваўшай

[59] Там жа, с. 106.
[60] Там жа, с. 108.
[61] *Знешняя палітыка Беларусі*, с. 202.
[62] РГАСПИ, ф. 5. оп. 1, д. 2001, л. 65.
[63] В. И. Ленин, *Неизвестные документы...*, с. 396-397.

вынікі першай таемнай сустрэчы кіраўнікоў дэлегацый[64]. Цяпер польскі бок патрабаваў у працяг паласы тэрыторыі, прылягаўшай з усходу да чыгункі Лунінец — Баранавічы — Ліда, новы пас замлі ў накірунку на паўночны ўсход такім чынам, што ён выводзіў Польшчу да мяжы з Латвіяй і цалкам аддзяляў РСФСР ад Літвы ў яе межах 1920 г. За гэта з польскага боку выказвалася згода ўключыць у дамову палажэнне аб прызнанні незалежнасці Украіны і Беларусі[65]. Новыя тэрытарыяльныя патрабаванні, нават кампенсаваныя саступкамі па ўкраінскім і беларускім пытаннях, былі адчувальным ударам па эканамічных і палітычных інтарэсах РСФСР — таму, перш за ўсё, што ўскладнялі сувязь РСФСР з яе патэнцыяльным саюзнікам у барацьбе супраць Версаля, найважнейшым эканамічным партнёрам — з Германіяй.

Якой жа была рэакцыя з савецкага боку? Страх бальшавіцкага кіраўніцтва перад польскай палітыкай „буферызму", як яна называлася на тагачасным савецкім жаргоне, быў не меншы за страх перад перспектывай зімовай ваеннай кампаніі на два франты. Таму па прапанове Леніна Палітбюро ЦК РКП(б) прыняло і гэтыя патрабаванні пры ўмове, што дамова будзе заключаная без прамаруджвання[66]. Пасля некаторай валтузні вакол артыкулаў матэрыяльнага характару 12 кастрычніка дамова аб перамір'і і прэлімінарным міры была падпісана. Пры яе ратыфікацыі УЦВК РСФСР 23 кастрычніка Чычэрын прама называў тэрытарыяльныя саступкі з боку Савецкай Расіі цаной за адмову Польшчы „от политики буферализма, от создания буфералистских государств"[67]. Характэрна, што да развалу СССР стэнаграма гэтага пасяджэння УЦВК не друкавалася.

А як жа з Чарвяковым? Чым жа займаўся ўсе гэтыя дні, калі сапраўды вырашаўся лёс Беларусі, прадстаўнік яе Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта? Пытанне аб прызначанай Чарвякову ролі на мірных перамовах узнікае не толькі ў сённяшняга даследчыка. 22 верасня яго ставіў перад сваім кіраўніцтвам і Адольф Іофэ, гэтаксама, як і аб прадстаўніку Галіцыйскага рэўкама з прозвішчам Баран. Чычэрын адказаў: „Адносна абодвух пачакайце, толькі прад'явіце [палякам — Р. Л.] паперу, якая ўпаўнаважвае нас устанаўляць мяжу Беларусі"[68]. Аднак свайго выхаду на сцэну рыжскай канферэнцыі Чарвякоў так і не дачакаўся. У лоне польскай дэлегацыі, як і ў польскіх палітычных сферах у цэлым, федэралісцкая канцэпцыя (Чычэрын яе называў буфералісцкай) прайграла, выйграла эндэкаўская канцэпцыя падзелу Беларусі з Расіяй. Гэты вы-

[64] J. Dąbski, *Pokój ryski...*, s. 110.
[65] В. И. Ленин, *Неизвестные документы...*, с. 397-398.
[66] Там жа, с. 398-399.
[67] ПСВ, ч. 2, с. 97-98, 103.
[68] ПСВ, ч. 2, с. 58.

нік барацьбы ў Польшчы па пытаннях усходняй палітыкі, якая не спынялася на працягу польска-савецкай вайны, выключыў на той момант неабходнасць для Польшчы шукаць кампраміснае пагадненне з урадам Ластоўскага[69]. А ў выніку з савецкага боку адпала неабходнасць выстаўляць на перагаворах Чарвякова супраць Ластоўскага.

Чарвякоў зразумеў сваю незайздросную ролю, моцна перажываў з гэтай прычыны. „Адзначаю цалкам бясспрэчна, што Беларусь удзелу ў перагаворах не прымае ні пад якім выглядам", — пісаў ён з Рыгі. „Горш за ўсё тое, — дадаваў ён у іншым лісце, — што раздзел Беларусі ўжо прадвырашаны і што гэтым маё добрае беларускае імя будзе скампраметавана навекі". Яго суцешыў Іофэ, канстатуючы, што дамову падпісвае Савецкая Расія, а не Беларусь „і ў беларускага народа рукі будуць развязаны"[70].

Гэтая гаворка Іофэ аб „развязаных руках" беларускага народа не была толькі звычайнай, хай сабе і цынічнай, эмацыянальнай рэакцыяй савецкага дыпламата на ўзніклую драматычную для Беларусі сітуацыю. Яна была натуральным для яго выяўленнем існаваўшага ў савецкіх кіраўнікоў перакананння ў нядоўгавечнасці Рыжскай дамовы. Логіка гэтай пазіцыі прымушала глядзець на Савецкую Беларусь як на інструмент аслаблення, а ў перспектыве і разбурэння рыжскага міру, каштоўны не столькі сам па сабе, колькі ў якасці супрацьвагі другому, больш прынцыповаму барацьбіту супраць падзелу Беларусі — ураду БНР. Аднак выканаць гэтую ролю, не кідаючы ценю на РСФСР, Савецкая Беларусь магла толькі пры наяўнасці хоць бы фармальных прыкмет дзяржаўнай самастойнасці. Таму не дзіўна, што менавіта Чычэрын, добра разумеўшы гэта, выступіў саюзнікам групы беларускіх нацыянал-камуністаў у справе афармлення беларускай савецкай дзяржаўнасці пасля таго, як прэлімінарны мірны дагавор уступіў у сілу. 3 лістапада 1920 г. ён падаў у Палітбюро ЦК РКП(б) вядомую беларускім гісторыкам запіску[71], у якой прапанаваў прыступіць да арганізацыі ў Беларусі савецкага ўрада, будуючы адносіны з ім па тыпу адносін РСФСР з Савецкай Украінай — „гэта значыць, пакідаючы Беларускую рэспубліку па-за РСФСР, але фактычна аб'ядноўваючы цэлы шэраг галін дзяржаўнай дзейнасці". Характэрна

[69] Гэтая сітуацыя, аднак, не ліквідавала „двухкаляёвы" характар польскай усходняй палітыкі, і польскія дыпламаты, звязаныя з Галоўным камандаваннем, г.зн., з Пілсудскім, працягвалі кантакты з Ластоўскім, якія трывожылі свавецкую дыпламатыю.

[70] *Знешняя палітыка Беларусі*, с. 202. Першую публікацыю, падрыхтаваную М. Шумейкам, гл.: „Коммунист Белоруссии", 1991, № 9, с. 16-20.

[71] Некаторыя беларускія гісторыкі, аднак, упарта паўтараюць памылку, зробленую пры капіраванні гэтага дакумента для былога Партархіва пры ЦК КПБ — Рыжскі дагавор, на які спасылаўся Чычэрын, называюць Парыжскім.

і матывацыя пазіцыі наркама: „Для барацьбы супраць польскага буферызму гэтую сістэму неабходна праводзіць з найвялікшай паслядоўнасцю, не дапускаючы ляпсусаў”[72]. Аднак той жа Чычэрын, застаючыся расійскім палітыкам, не падтрымаў спробы беларускіх нацыянал-камуністаў адрадзіць Беларускую савецкую рэспубліку ў межах на ўсходзе, існаваўшых у студзені 1919 г. і ўключаўшых, як вядома, Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую губерні. Гэтае пытанне патрабуе самастойнага разгляду і тут мы абмяжуемся толькі заўвагай наконт аргументацыі, ужытай Чычэрыным. У ёй выяўлялася няўпэўненасць у трываласці сітуацыі, створанай прэлімінарнай мірнай дамовай: „Мы яшчэ не ведаем, праз якія перыпетыі можа прайсці лёс Беларусі і павялічваць загадзя тую тэрыторыю, якая праз гэтыя перыпетыі будзе праходзіць, было б вельмі неасцярожна[73]. Тую ж пазіцыю займаў і Рэўваенсавет Заходняга фронту[74]. Такім чынам, беларускаму рэўкаму давялося брацца за стварэнне органаў улады Беларускай савецкай рэспублікі на тэрыторыі паміж межамі, устаноўленымі Рыжскай дамовай, і заходнімі межамі Віцебскай і Гомельскай губерняў, якія засталіся ў складзе Расіі.

ВРК БССР, усё яшчэ застаючыся органам Заходняга фронту для кіравання вызваленымі тэрыторыямі, дзейнічаў ранейшым метадам. Яго рашэнне аб скліканні з’езда саветаў Беларусі для стварэння цывільных пастаянных органаў улады было накіравана ў Рэўваенсавет Заходняга фронту, а той пераслаў яго ў ЦК РКП(б) і запрасіў указанняў[75]. ЦК РКП(б) правёў нараду па беларускім пытанні, выклікаўшы на яе Вільгельма Кнорына і Аляксандра Чарвякова. Яна палічыла „мэтазгодным і выгадным у цяперашні момант” скліканне з’езда саветаў Беларусі для канстытуіравання Беларускай савецкай рэспублікі, але толькі на абрэзанай тэрыторыі Мінскай губерні[76]. Заадно мінскія камуністы атрымалі каштоўную параду: „Калі ж няма ўпэўненасці, што на з’езд ад уездаў пройдуць савецка настроеныя элементы, то неабходна выкарыстаць масы чырвонаармейцаў, каб атрымаць большасць на з’ездзе і правесці нашы рэзалюцыі”[77].

З гэтага часу працэс пайшоў хутчэй. 20 лістапада ЦБ КП(б)Б прыняло рашэнне аб скліканні з’езда Саветаў Беларусі на 12 снежня і вызначыла яго парадак дня[78]. 26 лістапада аналагічнае рашэнне прыняў і ВРК БССР[79].

[72] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 478, л. 72; копія; апублікавана з памылкай, запазычанай з гэтай копіі: *Знешняя палітыка Беларусі*, т. 1, с. 214.
[73] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 478, л. 75.
[74] НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 477, л. 37.
[75] РГАСПИ, ф. 17, оп. 65, д. 342, л. 137.
[76] РГАСПИ, ф. 17, оп. 3, д. 122, л. 2.
[77] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 109, л. 33.
[78] ГАРФ, ф. 1235. оп. 95, д. 279, л. 20.
[79] ГАРФ, ф. 1235. оп. 95, д. 279, л. 18.

Рашэннямі абодвух органаў планавалася разгледзець на з'ездзе пытанне „Арганізацыя савецкай улады ў Беларусі". Які статус будзе мець гэтая ўлада, паказалі рашэнні III з'езда Кампартыі Беларусі, прайшоўшага паміж дзвюма названымі датамі і прыняўшага тэзісы „Па пытаннях арганізацыі савецкай улады". „Беларусія, з'яўляючыся Сацыялістычнай Савецкай рэспублікай, — гаварылася ў тэзісах, — адначасова з'яўляецца складовай часткай РСФСР, і ўсе [яе] органы ў вобласці агульных мерапрыемстваў павінны быць падпарадкаваны адпаведным камісарыятам РСФСР, але мець пэўную свабоду ў галіне вырашэння пытанняў мясцовага жыцця, у якіх яны павінны падлягаць кіраўніцтву ЦВК і Саўнаркама Беларусі"[80]. Такім чынам, статус БССР вызначаўся як аўтаномнай рэспублікі ў складзе РСФСР. Аднак у рашэннях самога з'езда Саветаў, прайшоўшага ў сярэдзіне снежня, гэты статус заканадаўча не быў афармлены, нягледзячы на тое, што з'езд прыняў дапаўненні да рэаніміраванай ім канстытуцыі 1919 г.[81] Пытанне аб статусе рэспублікі было пастаўлена ў дакуменце з'езда, не меўшым заканадаўчага характару — у „Прывітанні Расійскай і Украінскай сацыялістычным рэспублікам". У ім ад імя з'езда заяўлялася, „што ў аснову ўсіх далейшых узаемаадносін паміж ССРБ і РСФСР мусіць быць пакладзена прызнанне незалежнасці ССРБ і РСФСР, заяўленае ад імя УЦВК [РСФСР] на I з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі старшынёй УЦВК (...) Я. М. Свярдловым, і заява ў адказ I з'езда Савета ССРБ, выразіўшага жаданне быць у самай цеснай федэратыўнай сувязі з РСФСР, і прынятае ЦВК Саветаў рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх і батрацкіх дэпутатаў у яго дагаворнай пастанове ад 30 мая 1919 г., у якой устаноўлена поўнае аб'яднанне ўсіх ваенных сіл абедзвюх рэспублік, адзінства дыпламатычных высупленняў і ў вобласці народнай гаспадаркі, фінансаў і арганізацыі"[82].

Не з'яўляючыся заканадаўчым актам, гэтая адсылка да рашэнняў 1919 г., тым не менш, лагічна падрыхтавала ўключэнне ў апошні момант у праграму работы з'езда, зусім нечакана для большасці яго ўдзельнікаў, новых пытанняў — аб ратыфікацыі прэлімінарнай мірнай дамовы з Польшчай і аб пацвярджэнні рашэння ВРК БССР ад 10 верасня наконт перадачы РСФСР мандата на вядзенне мірных перагавораў[83]. Ініцыятыва пастаноў-

[80] *Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК*, т. 1: *1918-1927*, Мінск 1973, с. 55.

[81] Гл.: *Борьба за советскую власть в Белоруссии. Сб. док. и материалов в двух томах*, т. 2, Мінск 1971.

[82] *Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению советской власти...*, с. 461.

[83] У вядомых нам крыніцах гэтыя рашэнні аб'яднаныя ў адным дакуменце. Гл.: *Революционные комитеты БССР и их деятельность по упрочению советской власти...*, с. 475.

кі на парадак дня з'езда гэтых пытанняў зыходзіла з маскоўскіх інстанцый — Сакратарыята ЦК РКП(б) (Красцінскі) і Наркамата па замежных справах[84]. Аж да моманту адкрыцця з'езда іх дапільноўваў усё той жа Чычэрын, заклапочаны даходзіўшай да яго іфармацыяй аб магчымасці прыняцця з'ездам рашэння аб пасылцы дэлегацыі ад БССР на Рыжскую канферэнцыю. Аж да самага адкрыцця з'езда такая магчымасць сапраўды існавала і выходзіла яна з двух вытокаў. Адным з іх была частка камуністаў з мясцовых арганізацый, якія занадта літаральна ўспрынялі ідэю Іофэ аб тым, што пасля дагавору з Польшчай „у беларускага народа рукі будуць развязаныя". У Беларусі яе адразу ж пачалі праводзіць камуністычныя сродкі прапаганды[85]. На асобных мясцовых партыйных з'ездах ставілася пытанне аб самастойнасці Беларусі[86]. Яшчэ энергічней его падымалі беларускія эсэры[87], аб чым Чычэрыну было вядома з непасрэдных кантактаў з іх прадстаўнікамі[88]. Наркам вырашыў прыняць папераджальныя захады, хаця, як высветлілася пазней, толькі адзін з эсэраў прарваўся на з'езд Саветаў Беларусі. 12 кастрычніка наркам паслаў у Мінск тэлеграму, у якой заяўляў, што Беларусь толькі тады зможа мець міжнародныя адносіны, калі аформіцца яе ўрад[89]. Не абмежаваўшыся гэтай тэлеграмай, 13 снежня, у дзень адкрыцця з'езда, ён выклікаў да прамога провада Кнорына і зноў запатрабаваў ад яго пацвярджэння з'ездам мандата, выдадзенага Савецкай Расіі ВРК БССР, і ратыфікацыі прэлімінарнага міру. „Пацвярджэнне прэлімінарнага міру вельмі пажаданае асабліва з прычыны спробаў адраджэння буферызму з боку асобных польскіх дзеячаў і газет", — гаварыў Чычэрын[90]. Кнорын успрыняў гэтыя ўказанні як загад: „Будзе зроблена менавіта так, як па Вашым меркаванні гэта неабходна, — адказаў ён. — Ва ўсіх сваіх кроках і выступленнях мы будзем звязвацца з Вамі і запрошваць Вашых указанняў"[91].

Пасля размовы з Чычэрынам Кнорын адправіўся на пленум ЦБ КПБ(б) з удзелам прадстаўнікоў паветаў, дзе былі сфармуляваныя сак-

[84] НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 452, л. 127.

[85] Гл. адозву ЦБ КП(б) ад 14 кастрычніка ў сувязі з з падпісаннем папярэдняга міру: НАРБ, ф. 60, воп. 3, спр. 458, л. 13; апублікаваная з адхіленнямі ад арыгіналу: *По воле народа: Из истории образования БССР и Коммунистическо партии Белоруссии*, Минск 1988, с. 186-187. У тым жа духу артыкул Кнорына ў „Звезде" 21/X пад загалоўкам „Мир и Белоруссия", [у:] В. Г. Кнорин, *Избранные статьи и речи*, Минск 1990, с. 67-68.

[86] НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 430, л. 73-74.

[87] Гл. аб дзейнасці эсэраў: НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 118, л. 68-75; В. Лебедзева, *Пуцявінамі змаганняў і пакутаў. Палута Бадунова*, Мінск 2004, с. 34-35.

[88] РГАСПИ, ф. 5. оп. 1, д. 2000, л. 6.

[89] РГАСПИ, ф. 5. оп. 1, д. 2000, л. 33.

[90] НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 452, л. 127.

[91] НАРБ, ф. 60п, воп. 3, спр. 452, л. 130.

рэтныя дырэктывы, накіраваныя на апрацоўку дэлегатаў з'езда ў духу атрыманых указанняў. Яны былі настолькі красамоўныя, што заслугоўваюць даслоўнага цытавання: „Слухалі: аб выступленні членаў (фракцыі камуністаў — Р. Л.) на фракцыйных і пленарных пасяджэннях (з'езда — Р. Л.). Пастанавілі: а) ніводнаму члену фракцыі не дазваляецца выступаць на з'ездзе па пытанні аб самастойнасці Беларусі; б) пытанне аб самастойнасці Беларусі ў партыйных колах не падымаць і ніякіх дыскусій з гэтай нагоды не падымаць; в) павятовым дэлегатам прапануецца [гэту] пастанову перадаць тактычна і дыпламатычна.

За сакратара ЦБ — Вайнер"[92].

Такім чынам, працаваўшыя ў Беларусі камуністы, прысвоіўшыя сабе права гаварыць ад імя беларускага народа, на самой справе не наважыліся выступіць у абарону яго інтарэсаў і яшчэ раз пакінулі лёс Беларусі ў руках Савецкай Расіі. А тая, жадаючы закончыць мірам перамовы, якія ўсё болей зацягваліся, у рэшце рэшт пайшла на дадатковыя тэрытарыяльныя саступкі Польшчы за кошт Беларусі. Найбольш значнымі яны былі на Палессі: калі прэлімінарны мірны дагавор вызначаў лінію мяжы ў гэтым рэгіёне па рацэ Лань, то канчатковы — па рэках Морач і Случ, на некалькі дзесяткаў кіламетраў далей на ўсход.

Заманліва цяпер скончыць артыкул, як і пачыналі — цытаваннем верша, але ўжо іншага беларускага паэта, на тэму рыжскага падзелу:

„*Пасеклі край наш папалам,*
Каб панскай вытаргаваць ласкі.
Вось гэта вам, а гэта — нам,
Няма сумлення ў душах рабскіх".
(Алесь Дудар)

Але не будзем хавацца за плечы паэтаў, падвядзем вынікі. Абвяшчэнне БССР у канцы ліпеня 1920 г. было звязанае са спробай бальшавіцкага ўрада „перанесці на штыках" рэвалюцыю ў Польшчу, каб затым прыступіць да саветызацыі Усходняй Еўропы, ад Прыбалтыкі да Румыніі, а ў спрыяльнай для бальшавікоў сітуацыі — і больш шырокага яе абсягу. Абвяшчэнне Беларускай савецкай рэспублікі, з аднаго боку, служыла сродкам забеспячэння прадполля і тыла для гэтага паходу, з другога — мусіла сведчыць працоўным Польшчы і Заходняй Еўропы аб адсутнасці ў савецкага ўрада імперыялістычных намераў. Няўдача паходу Чырвонай Арміі ў Польшчу змяніла ролю, адведзеную Савецкай Беларусі ў палітыцы РСФСР. Цяпер яна мусіла служыць картай у дыпламатычнай гульні савецкага ўрада ў ходзе мірных перамоваў, да часу прыхаванай і прыдатнай для выкарыстання ў залежнасці ад сітуацыі. Валоданне гэтай картай забяспечыла рашэнне ВРК БССР аб прыз-

[92] НАРБ, ф. 4п, воп. 1, спр. 112, л. 67.

нанні за Савецкай Расіяй права весці перамовы з Польшчай аб польска-савецкай мяжы на тэрыторыі Беларусі. Атрымаўшы яго, маскоўскія інстанцыі праз Рэўваенсавет Заходняга фронту прыпынілі працэс канстытуіравання Беларускай савецкай рэспублікі. Атрыманы мандат, з аднаго боку, даваў савецкаму ўраду сродак палітычнага гандлю ў адносінах з Варшавай, дазваляючы быць цвёрдым на ўкраінскім участку лініі фронту і саступлівым — на беларускім участку. З другога боку, ён ствараў аргумент для адхілення патрабавання ўрада БНР аб удзеле ў мірнай канферэнцыі, маўляў, ёсць іншы — савецкі — беларускі ўрад, ці эвентуальна дазваляў супрацьпаставіць яму фіктыўны беларускі савецкі ўрад, калі б гэтыя патрабаванні падтрымала Польшча. А імавернасць іх падтрымкі існавала ў той ступені, у якой мела шанцы на рэалізацыю федэратыўная канцэпцыя польскай усходняй палітыкі. Пры ўсіх гэтых варыянтах БССР заставалася толькі інструментам палітыкі Масквы на заходнім накірунку, які выкарыстоўваўся з тымі ці іншымі мэтамі ў залежнасці ад сітуацыі. Гэты інструмент, аднак, быў дастаткова значным, каб згадзіцца на яго трансфармацыю з органа ваеннага кіраўніцтва часткай беларускай тэрыторыі ў форму нацыянальнай аўтаноміі. Першы крок у гэтым накірунку быў зроблены рашэннямі II з'езда саветаў Беларусі, а наступны, ужо за храналагічнымі межамі нашага паведамлення, — заключэннем 16 студзеня 1921 г. „Дагавора аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР"[93]. Застаецца заўважыць, што ўвесь час, пакуль ішлі польска-савецкія перамовы, так моцна паўплываўшыя на лёс Беларусі і, у прыватнасці, на яе савецкую квазідзяржаўнасць, за плячыма ўдзельнікаў перамоваў нябачна знаходзіўся ўрад БНР, які з'яўляўся, у прынцыпе, носьбітам альтэрнатывы польска-савецкаму падзелу Беларусі. Ва ўмовах, якія на той момант склаліся, шанцы на рэалізацыю гэтай альтэрнатывы былі невялікія (хоць наколькі невялікія — гэтае пытанне трэба вывучаць асобна). Не здолеўшы ўратаваць Беларусь ад падзелу, урад БНР, аднак, уратаваў беларускую савецкую квазідзяржаву, ствараючы ўмовы для яе нараджэння ў той адзінай ролі, якая была для яе магчымай — у ролі інструмента савецкай палітыкі.

Streszczenie

Podział Białorusi w 1921 r. dokonał się w Rydze bez udziału Białorusinów. Było to porozumienie polsko-bolszewickie. Bardzo sugestywnie pisał o tym Janka Kupała w wierszu *Nas podzielili.* Wkrótce jednak na Białorusi Radzieckiej zaprzestano pisania o podziale kraju przez sąsiadów. Przyjęto wersję o podboju ziem Zachodniej Białorusi przez Polaków, tak jakby bolszewików w tym procesie podziału w ogóle nie było. Historycy białoruscy nadają

[93] Гл. *Знешняя палітыка Беларусі*, с. 243-244.

dużą wagę deklaracjom wydawanym przez różne białoruskie organizacje — komunistyczne i lewicowe, jakoby one stanowiły jakiekolwiek znaczenie dla zaistnienia sowieckiej Białorusi. W rzeczywistości decyzje podejmowano w Moskwie przez władze centralne WKP(b). Komitety lub rady występujące pod szyldem białoruskim miały jedynie tworzyć pozory realizacji bolszewickich projektów politycznych zgodnie z wolą białoruskiego ludu. Planując ofensywę rewolucyjną w kierunku zachodnim, Lenin dokonał drugiego czysto formalnego ogłoszenia białoruskiej państwowości, dając narodom Europy dowód bolszewickiej wrażliwości na sprawy narodowe. Po przegranej ofensywie, gdy zaczynały się polsko-bolszewickie rozmowy pokojowe, faktycznie nie istniały żadne władze BSRR. Dlatego tę, tylko formalnie istniejącą strukturę, reprezentowali bolszewicy. Rząd BRL Wacława Łastowskiego, który dopominał się o dopuszczenie do udziału w konferencji był ignorowany zarówno przez Polaków, jak bolszewików.

Summary

Belarus was divided in 1921 in Riga without Belarusians' participation. It was an agreement between Poland and Bolsheviks. Yanka Kupala wrote very expressively about this in his poem *We were divided.* Soon, however, in the Soviet Belarus people stopped writing about the state's division by its neighbors. A version about the seizure of West Belarus by the Poles was adopted as if there were no Bolsheviks at all in the division process. Belarusian historians attach great importance to declarations made by various Belarusian organizations — communist and left-wing, as if they were of any significance for the existence of Soviet Belarus. In fact, decisions were taken in Moscow by the Communist Party of the Soviet Union central authorities. Committees or Boards that were acting under the Belarusian aegis were merely to create an impression of realizing Bolshevik political projects in accordance with Belarusian people's will. Planning revolutionary offensive on the West, Lenin made a second, purely formal declaration of Belarusian statehood, thus giving European nations a proof of Bolshevik sensitivity to national matters. After the lost offensive, when Polish-Bolshevik peace talks started, actually no BSRR authorities existed at all. That is why Bolsheviks represented the structure which existed only formally. Wacłau Łastouski's Belarusian People's Republic government, which insisted on admitting it to participation in the conference, was ignored both by the Poles and Bolsheviks.

Ryhor Ryhorawicz Łaźko — profesor Uniwersytetu Państwowego w Homlu, kierownik Katedry Historii Powszechnej. Autor kilkunastu prac dotyczących międzynarodowego położenia Białorusi i Polski w latach 1918-1939.